# УПЛЫЎ ЛІЦВІНСКАГА СЕПАРАТЫЗМА НА ПЕРАДУМОВЫ ПЕРШАГА ПАДЗЕЛА РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

*Дз.В. Станкевіч, магістрант, ГрДУ, Гродна*
*нав. кір. – С.В. Марозава, докт. гіст. навук, праф., ГрДУ*

Разважаючы пра шляхту ВКЛ і яе удзел у палітычных працэсах канца XVIII ст. трэба сказаць, што тут можна заўважыць шматлікія праявы сепаратызму. Існуючы палітычны лад Рэчы Паспалітай, дзе Статут ВКЛ 1588 г. прадугледжваў ВКЛ, як самастойную адзінку, але на практыцы Варшава дыктавала ўмовы і палітычны лад. Менавіта таму незадаволенасць палітыкай апошняга караля развівала пачуццё "адасаблення" у ліцвінскай шляхты.

Пасля смерці Аўгуста III магнацкія партыі "Фамілія" (фактычныя кіраўнікі Чартарыйскія) пачынае барацьбу за каралеўскую пасаду, для таго каб, паставіць свайго стаўленіка на прастол. У супрацiў выступалі з сепаратыскімі настроямі Караль Станіслаў Радзівіл "Пане Каханку" у саюзе з Клеменсам Браніцкім, якія ўмоўна называлі сябе "рэспубліканскай" альбо "гетманскай" партыяй [4,с.118].

У шляхецкіх колах ВКЛ "Пане каханку" меў яўны аўтарытэт, таму з лёгкасцю мог аслабіць пазыцыі "Фаміліі" у ВКЛ і ўплываць на ход галасавання не ў пользу "сямейнай" партыі. Тым больш ўплывовасць на шляхту, як саслоўе якому прыналежыць права голасу на павятовых сейміках, азначала перамогу аб вырашэнні кіравання дзяржавай і далейшага яе лёсу.

На гэта і зрабілі стаўку палітычныя праціўнікі. Ствараючы карціну адмоўнага партрэту "Фаміліі", Радзівіл змог на сейміках на тэрыторыі ВКЛ абраць сваіх дэпутатаў. Для гэтага Чартарыйскія вырашылі дзейнічаць замежнай сілай, у якасці якой і выступала Расійская імперыя, якая юрыдычна стала гарантам стварэння умоў для абрання новага караля.

Тым часам на канвакацыйным сейме барацьба паміж Чартарыйскімі і Радзівіламі набывала сур'ёзны характар. 7 мая 1764 года быў сарваны сейм, так як маршал гэтага сейма Малахоўскі, прыхільнік "рэспубліканскай партыі", дапусціў, што на яго рашэнні могуць ўплываць замежныя сілы, у якасці якіх выступалі расійскія войскія. Чартарыйскія не маглі дапусціць перавыбараў, бо ў будучым большасць шляхты будзе схільнай да Радзівілаў і ўсе стараннi "Фаміліі" будуць марныя.

Караль Радзівіл вырашыў дзейнічаць той самай сілай, якой ён дамогся на павятовых сейміках – узброеннай. Разам са сваёй надворнай міліцыяй у чэрвені 1764 г. ён рушыў з Бялай на Падляшшы, спусташаючы на беларускіх землях маёнткі сваіх ворагаў і прыхільнікаў «Фаміліі».

Пры тым, што Расійская імперыя была зацікаўлена ў моцных прадстаўніках сваіх пазіцый у Рэчы Паспалітай, разглядала сепаратныя настроі ў якасці сілы, якая можа прадстаўляць яе пазіцыі. Асоба «Пане Каханку» выклікала вялікую зацікаўленасць у расійскага двара. Выдаткоўваліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вялікія сродкі, каб перацягнуць на свой бок «непакорлівага» магната. Але Караль Радзівіл не толькі не прыняў прапанову імператрыцы, але і абразіў расійскага пасла падчас візіту апошняга ў Радзівілаўскай рэзідэнцыі.

"Пане Каханку" не мог выкарыстаць ваенныя сілы для падтрымкі апазіцыі, спачатку Ян Браніцкі разам з Францішкам Патоцкім перайшлі на бок "Фамілii", а ў хуткім часе не змог супрацьстаяць расійскай ваеннай падтрымкі і страціўшы свае рэзідэнцыі ў Нясвіжу і Слуцку, быў вымушаны пакінуць Радзіму [4, с. 120].

Чартарыйскія сваімі сіламі стварылі канфедэрацыю абралі маршала сейма Адама Казіміра Чартарыйскага, тым самым прыбіраючы да сваіх рук палітычны лёс Рэчы Паспалітай. З дапамогай створаннай канфедэрацыі было вырашана правесці шэраг рэформ і скасаваць liberum veto. Але замежным пратэктарам не спадабаўся такі падыход "Фамілii", і успрымаючы такія умовы паабяцалі падтрымку толькі кандыдата на пост караля [3, с. 361]. Правёўшы серыю пераўтварэнняў у эканамічнай і судовай сферы, партыя "Фамілія" прывялі пастанову аб наследванні прастола. Кароль павінен быць польскім шляхцічам, каталікам, які разумее законы Айчыны. Пацвердзіўшы гэтую пастанову была назначана дата элекцыйнага сейма на 27 жніўня 1764 г. . Каб замацаваць сваё становішча Чартарыйскія падтрымалі як Генеральную Літоўскую канфедэрацыю, так і Генеральную Кароную канфедэрацыю, якія існавалі некаторы час для выбрання караля і затым для замацавання рэформ канвакацыйнага сейма.

Выключэнне апазіцыі спрыяла для правядзенне рэформаў. Гэта быў пачатак сур'ёзнага рэфармавання краіны, якая за перад праўлення Сасаў ( з 1696 па 1763) аказалася ў застоі. З 7 мая па 24 чэрвеня сейм ухваліў 180 рашэнняў прычым, за перыяд каралявання Аўгуста III за 27 гадоў не было прынята ніводнага рашэння, так як ўсе сеймы зрываліся [2, с. 212].

За некалькі дзён да выбараў расійская канцылярыя выдала пракламацыю, усхваляючы кандыдатуру на пост караля Рэчы Паспалітай "пяста": "<...>майстэрства кіравання Рэчы Паспалітай можна даведацца толькі ў Рэчы Паспалітай, і той больш здольны да гэтага дасягнення, хто з юнацтва выхоўваўся ў духу яе свабоды, вывучаў і слухаў яе правы і законы <...>. У дэкларацыі прускага паслання абвяшчалася <...> як карысць, так і гонар вашай нацыі, патрабуюць, каб кандыдат быў абраны каралём, які з'яўляецца толькі родам з Рэчы Паспалітай, які не будзе змешваць яе інтарэсы з незнаёмцамі і ажыўляць славу Ягелона і Сабескага <...>[6, с. 19]".

7 верасня 1764 года, пры невялікім ўдзеле шляхты й прысутнасці расійскіх войскаў (7 000 салдат на межах Рэчы Паспалітай) у выніку фактычнага перавароту каралём Рэчы Паспалітай быў абраны Станісалаў Аўгуст Панятоўскі.

13 верасня кароль пакляўся выконваць pacta conventa. 25 лістапада 1764 года ў дзень імянін караля арцыбіскуп Гнезна і кардынал Рэчы Паспалітай, Уладзіслаў Юбінскі, ўвянчалі каронай Польшчы касцёле Св. Яна ў Варшаве. Для шоку кансерватараў кароль апрануўся не ў традыцыйнай сармацкай вопратцы, а ў іспанскім строі XVI стагоддзя.

Прадстаўнікі шляхты ВКЛ былі падзелены на тых, хто прытрымліваўся курса на палітычныя рэформы, прытрымліваючыся партыі "Фамілii" і пазіцыі караля і непрымерымая апазіцыя, якая жыла што жыла па прынцыпу заведзеным Гедэмінам ў XIV ст. "не рушыць даўніны", але і прытрымлівалі сваі погляды на караля "Пане Каханку" бачыўшы ў ім абаронца не столькі правоў, колькі заведзеныя часам стаўшы нацыянальным прыярытэтам. Увогуле гэта асоба была папулярна ў шляхецкіх колах. Калі толькі звярнуцца і ўспомніць, што мянушка "Пане Каханку", пайшла ад таго, што называючы так шляхту рознага маёмаснага цэнзу, ён не разглядаў сябе як магнатэрыю, але як роўнага з кожным. Ягоныя кансерватыўныя погляды, нават лад жыцця – сармацкага шляхціча, выклікалі ў прывілеграванага саслоўя павагу і адсюль такая падтрымка і папулізм асобы.

Каб не супярэчыць пазіцыі "Фамілii" многія шляхцічы, былі вымушаны прыняць караля, як свайго правіцеля, але памылка вярхоўная ўлады заключылася ў тым, што ўмяшальніцтва замежнай сілы на ўнутраныя працэсы ў Рэчы Паспалітай, рабіла С.А. Панятоўскага не папулярным, столькі колькі шляхта бачыла ў ім "лялькай з пецярбургскага двара". Таму навязаная прысяга яшчэ больш абвастрыла сепаратызм у шляхецкіх колах ВКЛ, што ў будучым азначала, разлад шляхты усёй Рэчы Паспалітай. Адсутнасць адзінай пазіцыі ў многіх палітычных пытаннях, дзе Расійская імперыя па прынцыпу "Разделяй и властвуй" змагла скарыстаць самыя "набалелыя" пытанні і выкарыстоўваць шляхецкае грамадства ў сваіх інтарэсах.

У канцы лістапада на каранацыйным сойме расійскі дэпутат Мікалай Рапнін запатрабаваў увядзення роўнасці для паслядоўнікаў праваслаўя і пратэстантаў, але Станіслаў Аўгуст не падтрымаў гэтыя патрабаванні. Ён стараўся заставацца нейтральным, не жадаючы настройваць супраць сябе большую частку каталіцкага дваранства. Фактычна кароль не мог праявіць палітычную самастойнасць у вырашэнні пытання аб уладзе і ў скорым часе Кацярына II прад'явіла ультыматым, згодна з якім прыгнячэнне праваслаўных не адпавядае грамадскім прынцыпам і для падтрымання парадку на тэрыторыю Рэчы Паспалітай будзе ўведзена 40 тысячнае расійскае войска.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Па рэлігійнаму складу партыя «Фаміліі» складалі прадстаўнікі каталіцкага веравызнання. Ураўнаванне з праваслаўнымі і прадстаўнікамі іншых канфесій было не дапушчальным. Выхаваны ў духу сармацкай ідэалогіі шляхта лічыла каталіцызм, адной з прыкмет нацыянальнай ідэнтычнасці. Раўнавага азначала парушэнне альбо пасягненне на правы і свабоды шляхецкіх колаў. Тым больш дзейнічаў прынцып забароны пераходы з каталіцтва ў іншае веравызнанне.

Сейм 1766, у гістарыяграфіі празваны «сеймам Чапліца» (ад імя маршалка гэтага сейма), дзе толькі пад пагрозаю увядзенне войск абвясціў свабоду веравызнання, але ў наданні палітычных правоў дэсідэнтам было адмоўлена.

У 1767 годзе праз прарасійска настроенную шляхту і расійскага амбасадара ў Варшаве князя Мікалая Рапніна Кацярына II ініцыявала прыняцце так званых «кардынальных правоў», якія ліквідавалі вынікі праграсіўных рэформаў 1764 года.

Выкарыстоўваючы не каталіцкую шляхту, на фоне гэтых падзей Расійская імперыя і Прусія ў Слуцку у 1767 г. стварыла канфедэрацыю праваслаўных і кальвіністаў, замежныя дзяржавы тым самым падтрымалі "дэсідэнцкую" шляхту ВКЛ, узмацняючы нянавісць як да праграсіўных змяненняў, так і да рашэнняў караля. Рэальна нешматлікая шляхта Слуцкай канфедэрацыі не змагла бы вырашыць "рэлігійнае пытанне" і пад прыкрыццём "парушэнняў даўніх свабод" на палітычнай арэне з'яўляецца Караль "Пане Каханку". Ягонае з'яўленне было падрыхтавана расійскім дварам, бо яшчэ ў эміграцыі "Пане Каханку" накіроўваў расійскай імператрыцы лісты, дзе магнат "каяўся за свае правінны" [4, с. 124].

Паказальныя тлумачэнні Рапніна пра выбар кіраўніком маючай завязацца канфедэрацыі менавіта Караля Радзівіла: "Я больш пэўны ў ягонай залежнасці ад нас, чым каго-кольвек іншага. Я павінен мець каля сябе паслухмяных людзей, а не чакаць на тое, каб справы, якія я вяду, залежалі ад людзей, на якіх не маю надзеі" [5].

Цяпер Рэпнін убачыўшы, тое што гэта занепакоіла караля пачаў дзейнічаць рашуча. Першае, чаго запатрабаваў расійскі пасол ад караля - гэта далучэння яго да акту канфедэрацыі. Панятоўскі пагадзіуся, не пярэчачы.

На сойм, які быў прызначаны на кастрычнік 1767 г., выбары адбываліся паводле жадання расійскіх уладароў. Апроч грошаў, у ход ішоў подкуп дэпутатаў ордэнамі Расійскай імперыі. Так, Караль Радзівіл і маршалак літоўскай канфедэрацыі Брастоўскі атрымалі з Пецярбурга ордэны Св.Андрэя. Для тых хто не згаджаўся прыняць умовы дзейнічала тактыка "кнута". У цэлым Рапнін дамогся ад канфедэратаў выдання маніфеста, які абвяшчаў царскія войскі "пасільнаю і сапраўднаю дапамогаю народу... Усех тых, якія супраціўляцца ім наважацца або непрыяцельскім чынам нахабна паводзіцца з імі пасмеюць, ворагамі Айчыны прызнаныя будуць і паводле права і дадзенае нам улады судзіць і караць іх будзем..." [7, 172].

Пастанаўленне Варшаўскага сейма пра пацвярджэнне прывілегій князям Радзівілам – уладальнікам Нясвіжскага княства, прадстаўленнай ім на захаванне дзяржаўных актаў ВКЛ [1, с. 200], пасутнасці пацвердзіла правы Радзівілаў на ўплыў на ліцвінскую шляхту. Пацвярджэнне прывілегій на права захаванне дакументаў і грамат стварыла манаполію магнатэрства на ўладу. Расійская дзяржава атрымала падтрымку сярод апазіцыйна настроеннай шляхты, страціўшы "Фамілію" набыла сабе прыбытны "кавалак" для далейшай палітычнай гульні.

Выкарыстанне настрояў ліцвінскай шляхты дапамагло расійскаму двару укараніцца ў палітычнае жыццё Рэчы Паспалітай, але ў будучым з сепаратным настроем ВКЛ Расійская імперыя будзе у будучым мець шэраг праблем. Пры тым, што такі сепаратны настрой дазволіў перайсці ад застойнага перыяду першай сярэдзіны XVIII ст. да перыяду рэфармавання краіны.

*Літаратура*

1. Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов. Том 2. С середины XVII до конца XVIII века, до воссоединения с Россией / под ред. Азарова А.И., Карпачева А.М., Корнейчик Е.И. – Мн.: Издательство Академии наук БССР, 1960. – 562 с.
2. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]; Рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2004. – 344 с.
3. Грабеньский, В. История польского народа / В. Грабеньский. – Мн.: Полиграфическое издательство им. Я.Купалы, 2014 – 800 с.
4. Прыбытка, Г. Барацьба магнацкіх груповак ў XVIII ст. // Спадчына. 1996. №1. С. 80–150.
5. Прыбытка, Г. Святло і цені Бара. Барская канфедэрацыя на Беларусі: перадумовы і ход / Г. Прыбытка // Гістарычная брама: гісторыка краязнаўчы часопіс [Электроны рэсурс]. – 2003. – Рэжым доступу: http://brama.brestregion.com/nomer21/artic02.shtml. Дата доступа: 23.03.2018.
6. Соловьёв, С. История падения Польши / С. Соловьёв – М.: АСТ,Астрель, 2003 – 372 с.
7. Sidorski, O. Panie Kochanku / O. Sidorski. – Katowice: Slask,1987 – s. 271.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ